# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# П. К. ЛЯХОЎСКАГА

**Перыяд дзеяння:**
жнівень 1941 г. – чэрвень 1944 г.

**Месца дзеяння:**
в. Старое Сяло

**Колькасць:**
35 чалавек

**Кіраўнікі:**
Ляхоўскі П. К. («Васіль»), М. А. Шпакаў

Група настаўніка П. К. Ляхоўскага («Васіль») налічвала 35 чалавек і дзейнічала ў в. Старое Сяло са жніўня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. У склад групы ўваходзілі пераважна настаўнікі і вучні мясцовых школ.

У снежні 1941 г. у в. Старое Сяло прыехаў М. А. Шпакаў, студэнт Маскоўскага авіяцыйнага тэхналагічнага інстытута, які ўключыўся ў актыўную падпольную работу і да ліпеня 1942 г. быў фактычна кіраўніком Старасельскай групы, у якой лічыліся яго бацька Андрэй Ільіч, маці Аляксандра Ільінічна і сястра Ніна Андрэеўна Шпакавы, М. К. і П. К. Ляхоўскія, Я. А. і І. П. Галубоўскія, Е. П. Барчанка, яго дочкі Надзея і Тамара, Ф. В. Ігнаценка, Я. Р. Булатаў, С. П. Гувеннікаў, урач М. Д. Вінічэнка, С. І. Раміцан, З. К. Багданава, А. М. Іспянкоў, медсястра М. А. Ганчарова і яе сястра Вольга, студэнт В. В. Глебаў, Т. В. Сініцына і інш.

20 красавіка 1942 г. пад Віцебск прыбыла група армейскай разведкі на чале з Ю. С. Рудаковым («Жорж», «Ягор»). З дапамогай Шпакава разведчыкі за кароткі тэрмін устанавілі сувязь з падпольнымі групамі, якія дзейнічалі ў Віцебску і яго наваколлі. Прыстанцыйная вёска Старое Сяло размяшчалася каля чыгункі Віцебск – Полацк, па якой гітлераўцы забяспечвалі групу армій «Цэнтр». У задачу падпольшчыкаў уваходзіла

назіранне за рухам па чыгунцы і шашы, за гарнізонамі, якія былі лакалізаваны на шляху ад Віцебска да Шуміліна.

Дзеячы падполля збіралі зброю для партызан, на кватэры А. С. Баброўскага прымалі зводкі Саўінфармбюро, вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва. А. Іспянкоў і К. Багданаў забяспечвалі партызан і разведчыкаў бланкамі розных дакументаў, Вінічэнка і Ганчарова – медыкаментамі і перавязачным матэрыялам, пад выглядам хворых ратавалі ваеннапалонных, арыштаваных сувязных і перапраўлялі іх да партызан.

З мая 1942 г. разведінфармацыя ад падпольшчыкаў стала пастурацъ у Віцебскія падпольныя райкамы КП(б)Б і ЛКСМБ. З мэтай удасканалення падпольнай работы ў ліпені 1942 г. Шпакаў перабраўся ў Віцебск, уладкаваўся на працу ў зброевую майстэрню акупантаў, наладзіў сувязі з падполлем. Сувязь з Ю. С. Рудаковым ажыццяўлялася праз Т. Е. Барчанка (Пруднікаву). У чэрвені група перададзена разведгрупе М. Р. Яфімава («Армейца»). У лютым 1944 г. жыхары Старога Сяла былі выселены ў Бешанковіцкі раён, дзе Ляхоўскі і падпольшчыкі працягвалі работу, астатнія пайшлі да партызан. М. А. Шпакаў загінуў на тэрыторыі Усходняй Прусіі ў складзе разведгрупы Чырвонай арміі. У партызанах загінулі І. П. Галубоўскі, Н. Е. Барчанка, В. В. Глебаў, Т. В. Сініцына. Фашысты расстралялі Ф. Баброву, К. Багданава, М. А. Ганчарову.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група П. К. Ляхоўскага і А. В. Міхайлоўскай – Р. М. Гіро / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 491–492.